строптивый	нязгодлівы, няўзгодны, упарты, упорысты, неслухмя`ны, [цупа`рты]
строчечный	радковы
строчить (подшивать)	штабнава`ць
строчить (из пулемёта)	штабнава`ць
строчка	радок
строчная буква	мала`я лі`тара
стругать	габлява`ць
стружка	габлёнка, габлю`шка
струиться	бруі`цца, струме`ніцца
струйка	цурок, струме`нік, бру`йка
струсить	збая`цца, спужа`цца, [стру`сіць]
стручок	струк

струя	струме`нь, бру`я, цёк
стряпать (на кухне)	гатаваць, [хоўдаць]
стряпать (грязное дело)	фабрыкава`ць
стряпуха	варэ`ўніца, [хоўда]
стрясти	стрэ`сьці
стрясись (случиться)	зда`рыцца, зрабі`цца, ста`цца
стряхнуть (яблоко)	стрэ`сьці
стряхнуть (со стола)	скі`нуць
студень (*кул.*)	халадзе`ц, квашані`на
студёный	сьцюдзёны
стужа	сьцю`жа, стынь
стукнуло в голову	у галаву` ўроілася; да галавы` прыйшло
стул	крэ`сла, столец
стул (*физиол.*)	надворак
ступай прочь!	пайшоў вон!
ступенька	прысту`пка, сходзень
ступор (*мед.*)	сту`пар, аслупяне`ньне
стучать	стукаце`ць, сту`каць, гру`каць, [дра`гаць], [гокаць]
стыд	сорам
стыдливый	сарамлі`вы, сарамя`жлівы, дзіклі`вы
стыдно	сорамна, сорам
стыдновато	посарам
стык	стык, [сутока]
стычка	суты`чка, [заторжка], [сты`тур]
стяжание	зыск, набыцьцё, прыдба`ньне
стяжатель	зьдзе`рца, хці`вец, хці`ўца, скна`ра
стяжать	прыдба`ць, набы`ць, здабы`ць, зыска`ць
стянуть (с подушки наволочку)	сьцягну`ць
стянуть (своровать)	укра`сьці
суббота	су(ы)бота
сугроб	сумёт, гу`рба, суве`й, [качагор]
суд	суд
сударыня (госпожа)	спада`рыня, па`ні
сударыня (незамужняя госпожа)	спада`рычна, пане`нка
сударь (господин)	спада`р, васпа`н

судачить	прастарэ`кацъ, бала`кацъ, багабосьціць, плятка`рыць
судебный	судовы
судебный пристав (исполнитель)	пазыва`чы
судить (*юр.*)	судзі`ць
судить (о чём-либо)	меркава`ць
судить да рядить	ра`ды ра`дзіць; ра`ду браць; меркава`цца; [талкава`ць]
судно (корабль)	плаве`нь, судно, [струг]
судок	пасу`дак
судорога	су`тарга, су`тарж
судьба	лёс, наканава`ньне, доля
судьбоносный	лёсавы
суеверие	пры`хамаць, пры`мхі, забабоны
суеверный	пры`хаматлівы, пры`мхлівы, забабонны
суета (ничтожность)	ма`рнасьць
суета (беготня)	мітусьня`
суета сует	ма`рнасьць над ма`рнасьцю
суетиться	мітусі`цца
суетливый	мітусьлі`вы
суетность	ма`рнасьць
суетный	ма`рны
суетня	мітусьня`, бегані`на
суждение	меркава`ньне, разважа`ньне
суждено	наканава`на, су`джана
сузить	зву`зіць
сук	сук
сук (толстый)	кокат
сук (тонкий)	жага`р
сук (сухой)	ставару`к
сукин сын	гад пе`чаны; няўлю`ддзе пага`нае; перагры`зак саба`чы; вы`хла шакля`тая
сукно (тонкое)	сае`та
суковатый	сука`ты
сулить	абяца`ць
сума	ка`йстра, торба
сума перемётная	узьве`й-ве`цер; пярэ`варацень
сумасброд	шале`нец, дзіва`к
сумасбродство	дзіва`цтва, шале`нства
сумасшедший (о человеке)	вар'я`т, [асташонак]

сумасшедший (поступок)	вар’я`цкі, [асташоны]
сумасшедший дом	вар’я`тня
сумасшествие	вар’я`цтва, [сумарок], [асташонасьць]
сумасшествовать	вар’ява`ть
суматоха (сумятица)	сумятня`, бегані`на, куламе`са, мітусьня`
суматошный	мітусьлі`вы
сумеречный	пры`цемны, зьмярка`льны
сумерки	зьмярка`ньне, зьмярк, сутоньне, сутонь, [пры`меркі]
сумерки (Европы)	заняпа`д
суметь	змагчы`, здолець, патра`піць
сумка	торба
сумка (кавалерийская)	са`ква
сумка (на поясе)	шабе`та
сумма	су`ма, квота
суммировать	падсумава`ць
сумничать	змудрава`ць, змудраге`ліць
сумрак	змрок
сумчатые (животные)	торбачнікі
сумятица	сумятня`
сундук	ку`фар
сунуться со своим носом	нос уваткну`ць (уторкнуць, увапхну`ць, усадзі`ць)
суп	суп, зу`па, поліўка
суп (кортофельный с салом)	крышаны`
суп (крупяной)	крупе`ня, кру`пнік
суп (перловый)	панца`к
суп (овсяный)	аўся`нка
супертяжеловес	цяжкавагаві`к
супостат (противник)	су`пар, супара`т
супруг	[сужэ`нак]
супруга	[сужэ`нка]
супружество	шлюб, [сужэ`нства]
Сураж	Сураж
суражский	сура`скі
сурепка (*бот.*)	сьвірэ`пка
суровый	суворы
сурок	байба`к
суррогат	сурага`т, падме`н, замяня`льнік
сусек	за`сек, ару`д
сустав (пальца)	чу`чанка, чучара`пка, суглоб

сутки	содні
сутолока (толчея, толкучка)	талачэ`ча, таўхані`на, штурхані`на, куламе`са, мітусяні`на, [сталока]
сутулый	гарбава`ты, пахі`лы
суть	су`тва, сутнасьць, цы`мус
сутяга	суяці`м
сутяжничать	мікі`цець
сутяжничество (*юр.*)	цягані`на па судох
суфлёр	суфле`р, падка`зьнік
сухарь	асу`шак
сухой	сухі`
сухолицый	худабра`зы
сухопутный	сухазе`мны
сухость	су`хасьць, сухме`ць
сухость во рту	асьмя`га
сухощавый (сухопарый)	хударля`вы, сухарля`вы, стрынглява`ты
сухоядение	сухоўрыца
сучить (нитки)	сука`ць
сучья	су`чча, рагаччо
суша	сухазе`м'е, сухазе`м
сушилка	суша`рня
сушка (белья)	сушэ`ньне
сушь	сухме`нь, су`ша
существенно	істотна, грунтоўна
существенный	істотны, грунтоўны
существительное (*грам.*)	назоўнік, [спакме`ньнік]
существо	істота
существо (дела)	су`тва, су`тнасьць
существование	існава`ньне, існе`ньне, бытава`ньне
существовать	існава`ць, існе`ць
сущий (существующий)	і`сны
сущий (дурак)	сапра`ўдны
сущность	су`тнасьць, іста`, су`тва, і`снасьць
схавать	зглы`мзаць
схватить	схапі`ць
схема	схе`ма, [красьлю`нак]
схлестнуться (в драке)	сьця`цца, счапі`цца
схлопотать (по шее)	атрыма`ць
схлынуть (о воде)	адысьці`
схлынуть (о чувствах)	ача`хнуць

сходимость	зьбе`жнасьць
сходить с ума (по ком?)	упа`дваць (за кім?)
сходка	сха`жка
сходни	сходы, сходкі
сходство	падабе`нства
сходящийся	зьбе`жны
схожий	падобны
схоластика	схаля`стыка
сцепиться (в драке)	сьця`цца, счапі`цца
сцепиться за грудки	ісьці` ў гру`дкі, зрэ`піцца
счалить	старнава`ць, зьвяза`ць вузлом
счастливая судьба	шчасьлі`вы лёс, шчасьлі`вая доля
счастливого пути!	у добры час! пу`хам дарожка! сакалі`нага лёту! шчасьць божа па дарозе!
счастливый	шчасьлі`вы, шча`сны
счастливчик	шчасьлі`вец, лёсік
счерневший	учарне`лы
счетовод	рахаўні`к
счетоводство	рахаўні`цтва
счёт (действие)	лічэ`ньне
счёт (забитых голов)	лік
счёт (подсчёт)	падлі`к, зьлічво
счёт (*бухг.*)	раху`накт
счёт (банковский)	раху`нак, конт
счёт (средства)	кошт
счёт (банковский)	раху`нак, конт
счётчик	лічы`льнік
счёты (конторские)	лічы`льнікі
счисление	зьлічэ`ньне
считать (*мат.*)	лічы`ць, рахава`ць
считать (до десяти)	лічы`ць
считать (иметь своё мнение)	даўніма`ць, меркава`ць
считать (сличить путём чтения)	счыта`ць
считать ворон (ротозейничать)	варон (га`ліц) страля`ць; му`хі лаві`ць
считать деньги не отходя от кассы	лічы`ць грошы на ме`сцы
сшибать (собирать выпрашивая)	каланты`рыць
съедобный	ядкі`, ядомы

съестной	е`сны, е`мны
съестное	ядкое, е`мнае
съёжиться	шчупу`ліцца, сцю`піцца, сцяцю`рыцца
съёмщик	найма`льнік
сыворотка	сыроватка
сыгранность	зла`джанасьць
сыграть (в шахматы)	згуляць
сыграть (на скрипке)	сыгра`ць
сыграть в ящик	ве`чкам накры`цца; душою рыгну`ць
сыграць свадьбу	зла`дзіць вясельле
сыздавна	здавён, з да`ўніх часоў, зда`ўна
сызмала	зма`лку, з мале`нства
сызнова	зноў, нанова
сын	сын
сын (приёмный)	не`сын
сыпной тиф	вы`сыпкавы ты`фус
сыпучий	сы`пкі
сыпь (на коже)	водрык
сыровато	на`дсыр
сырой (влажный)	волкі, вогкі, вільготны
сырой (ветер)	золкі
сырой (хлеб)	аце`сьлівы
сырость	золь, волкасьць, вогкасьць, сы`расьць
сырьё	сыраві`на
сыск (следствие)	сьле`дзтва, апасока
сыск (дознание)	дазна`ньне, апасока
сыск (поиск)	вы`шук, апасока, зыск
сыскать	знайсьці`, адшука`ць
сыскной	вышукны`, апасочны
сытный	нае`дны
сытость	сыць, сыціня`
сычуг (*анат.*)	кіндзю`к
сыщик	сок, апасочнік, дэтэкты`ў, сьле`дчы
съедите!	зьясьцё!
сюрприз	сюрпры`з, нечака`нка, неспадзява`нка
сюртук	сурду`т
т	

табак	тыту`нь
табак (нюхательный)	таба`ка
табак (турецкий)	мульта`н
табакерка (из рога)	рагаве`нь
табакерка (берестяная)	таўлі`нка
табачный	тытунёвы
таблица (умножения)	таблі`ца
табу	табу`, забарона
табуировать	табуява`ць, забараня`ць
табурет	столак
таверна	шынок, карчма`
таврить	таўрава`ць, клеймава`ць
тавтология	таўталёгія, тоеслоўе
таган	трыножка
таз	ра`жка, ра`жанка
таз (медный)	мядні`ца
таинство	тае`мства
таинственный	таямні`чы
тайком	спатайка`, употай, ціхама`тна
тайник	тае`мнік
тайное убежище	схоўка
тайные сношения	[канша`хты]
тайный	тае`мны
так	так, дык
так ведётся	так паводзіцца
так вздумалось	з ла`скі на паце`ху
так заведено	так вядзе`цца
так и быть!	такой бяды`!
так как	бо
так ли это было?	ці гэ`так было?
так оно и получилось	на тое й вы`йшла; так і ста`лася
так называемый	так зва`ны
так себе (сносно)	ні ў смак ні ў знак; дзе`ля гадзі`ся
так сказать	каза`ў той; казаў-бы
так только	дзе`ля гадзі`ся
так точно!	так!
также	такса`ма, гэтакса`ма
таким образом	такі`м чы`нам (спосабам, робам, пара`дкам)
таков	такі`
таковой	такі`, гэ`такі

такой	такі`
такой же	такі` са`мы
такой-сякой	такі` й гэ`такі
такой-то	такі` й такі`
тактичность	тактоўнасьць
тактичный	тактоўны
талант	та`лент
талантливый	таленаві`ты
талдычить	дака`зваць, трындоліць
талик	прата`ліна
там	там, та`мака
там же	тамса`ма
там и тут	дзе а дзе
тамада	[марша`лак]
таможенник	мы`тнік
таможенный	мы`тны
таможенная пошлина	мы`тны збор
таможенный досмотр	мы`тны агля`д
таможня	мы`тня
тамошний	тамтэ`йшы
танк	танк, [паўзе`нь]
танцевать	танцава`ць, та`ньчыць, скака`ць
танец	та`нец, танок
танцор	танцоўнік, скаку`н
танцорка	танцоўка, скаку`ха
тапки	тэ`пці
тапки (кожаные)	ціжэ`мкі
тапки (матерчатые)	трэ`пы
тарабарщина	галда`, талаба`сы
таракан	пруса`к
таракан (рыжий)	прус
тарантас	калама`жка
тарань (рыба)	тара`н
таратайка (лёгкая повозка)	тарада`йка
тараторить	лапата`ць, тарката`ць, саката`ць
таращить (глаза)	луп`іць, вылу`пліваць, выга`льваць
тарелка	тале`рка
тарелка (глубокая)	паўмі`сак
тары-бары	шулды`-булды`
таскать	цяга`ць, валачы`
таскать (воровать)	цяга`ць, кра`сьці

таскать (за волосы)	чуба`сіць, чу`біць
таскаться	швэ`ндацца, валачы`цца
тасовать (карты)	картава`ць
татарник (*бот.*)	бадзя`к
тать	злодзей
тачать (сапоги)	шыць
тащить	цягну`ць, валачы`
тащить (что-либо огромное)	тараба`ніць
тащить (воровать)	цягну`ць, кра`сьці
таяние	расстава`ньне
таять	растава`ць
тварь (живое существо)	стварэ`ньне, [створ]
твердить	паўтара`ць
твёрдый (о предмете)	цьвёрды, цу`пкі, каля`ны
твёрдый (характер)	цьвёрды, пэ`ўны
твердь	цьверж
творение	стварэ`ньне, творыва
Творец	Створца, Сотвар
творить (глупости)	рабі`ць, вытвара`ць, вырабля`ць, чворыць
творить поклоны	*чыні`ць паклоны*
творить суд	*чыні`ць суд, судзі`ць*
творить чудеса	*справава`ць дзі`вы*
творог	тварог
творожный	тварогавы
творческий	творчы
творчество	творчасьць, творства
театр	тэа`тар
театральный	тэа`травы
тезис	тэ`за
текстуальный	тэ`кставы
текучий	плы`нны
текущий (о жидкости)	цякомы, які цячэ
текущий (год)	бягу`чы, гэ`ты
текущий (счёт)	бягу`чы
текущий (момент)	суча`сны, цяпе`рашні
текущий (состав рабочих)	зьме`нны
текущий (ремонт)	праме`жкавы
текущий (поток)	цёклы
телевидение	тэлеві`зія
телега	калёсы
телега (для возки леса)	мажа`ры, ка`ры
телега (сломаная)	тарада`йка
тележка	драбі`нкі

телесный	це`лавы
телефон	тэлефон
телефонная трубка	слу`хаўка
телёнок	цялё, цяля`
тело	це`ла
тело человека	чалаве`чае це`ла
телогрейка	бравэ`рка
телодвижение	рух це`ла
телосложение	паста`ва, склад це`ла
телохранитель	целаахоўнік, [дра`бант]
тем более	пагатоў
тем временем	тым ча`сам
тем и закончилось	дый тым абышлося
тем не менее	і ўсё-ж
тем паче	пагатове
темень	це`мра, памрока, це`мрадзь
темница	вязьні`ца
темновато	поцемна, пры`цемна
темнота	це`мра, цем, цямрэ`ча, це`мрадзь, [цямры`нь]
темнота (невежество)	цямнота, не`вуцтва
температура	тэмпэрату`ра, пал, упол
темя	це`мя
тенета	се`тка, мярэ`жа, цянёты
тенькать	ці`ўкаць
теперешний	цяпе`рашні
теперь	цяпе`р, цяпе`рака
тепло (не холодно)	цёпла
теплота	цеплыня`, цяплы`нь, цяплосьць
теребить (перебирать)	перабіра`ць
теребить (дёргать)	ту`заць
теребить (тормошить)	тармасі`ць
теребить (щипать)	ску`бці, шчы`каць
теребить (лён)	рваць
теребить (чувства)	ту`заць, крана`ць
тереть	це`рці, шму`льгаць, шмуля`ць, шарава`ць
тереть (на тёрке)	дзе`рці, таркава`ць
тереть (хрен)	дзе`рці, драць
тереть (шею)	му`ляць
терзать	шкумата`ць, ту`рзаць, дзе`рці

терзать (причинять страдание)	му`чыць
терзать душу (сердце)	сэ`рца ад'яда`ць (кроіць)
терминология	тэрміналёгія, назваслоўе
терпеливый	цярплі`вы, трыву`чы
терпение	цярплі`васьць
терпетин	тарпаты`на
терпеть	перабыва`ць, цярпе`ць, трыва`ць
терпимо	памяркоўна, нішто сабе`
терпимый (к другим)	талера`нтны
терпкий	[корсткі]
терпнуть	[пе`рхці]
территория	тэрыторыя, [тэрэ`н]
терять (вещь)	губля`ць
терять (человека)	стра`чваць
теряться (исчезать)	губля`цца
теряться (утрачиваться)	тра`ціцца
теряться (в толпе)	губля`цца
теряться (в беде)	бянтэ`жыцца, губля`цца
теряться (о конкретных предметах)	тра`ціцца
теряться в догадках	розуму не дабіра`ць
тесак (по дереву)	склюд
тесать (камень)	часа`ць
тесать (дерево)	склюдава`ць
тесниться (в вагон метро)	ці`снуцца, плі`шчыцца, тачы`цца, шчамі`цца
тесёмка	та`семка, паварозка
тесновато	поцесна
тесный (вагон)	збойны
тесовый	дашча`ны
тест	тэст, вы`пыты
тестирование	тэстава`ньне, выпы`тваньне
тесьма	тасьма`
тетерев	цецяру`к, каса`ч
тетрадь	сшы`так, [кае`т]
технический	тэхні`чны
течение	плынь, плыў, патока
течка (у животных)	кнуроўка
течь	цячы`, бруі`цца
течь (о времени)	праходзіць, міна`ць
течь (в днище лодки)	прабоіна, це`ча

тёлка	цялу`шка
тёмной порою	цёмначы
тёмнорусый	бру`ды
тёмный (необразованный)	цёмны, няўзоркі, рэ`йпаны
тёплые края	вы`рай
тёпленький	цяплю`ткі
тёрка	та`рка, дра`чка
тёс	дошкі
тётя	цётка
тётя (по матери)	ву`йка
тёща	це`шча
тигр	ты`гра
тикать (о часах)	ча`пацць
тимьян (чабрец)	чабор
тина	твань
типический	тыповы
типографический значок	дручок
типография	друка`рня
типун тебе на язык	цыпу`н (ску`лу, стрык, кірдзю`к) табе` на язы`к
тире (*грам.*)	праця`жнік
тиски (из дерева)	кляшчоткі, скамы`
тиски (из металла)	шрубшток, сусту`гі, кнэ`блі
тиски (слесарские)	клю`бы
титло	ці`тла, надпі`сак
титька	цы`цка
тиун	цівун
тиф	ты`фус
тихий	ціхі`, за`цішны
тихий ангел пролетел	Ці`хан нарадзі`ўся; хоць мак сей
тихомолком	цішком, сыці`ха
тихонько	ціхе`нька, ціху`тка, паці`ху
тихоня	ціхе`нь
тихоструйный	ціхаплы`нны
тише иди!	пама`лу йдзі!
тишина (тишь)	цішыня`, ці`ша, ціхме`нь, за`ціш
ткань (материя)	ткані`на
ткань (редкая)	радабодзь
ткань (льняная)	порт
ткань (*биол.*)	тка`нка
ткнуть	тнуць, ты`кнуць, торкнуць, ты`цнуць

ткнуть (свой язык)	ты`цнуць, су`нуць
тлеть	цьмець
тмин	кмен
то	дык
то бишь (то есть)	ці тое; то бок
то и дело (регулярно)	раз у раз; абы` час
то и дело (с перерывами)	раз-пораз; раз у раз
то и знай (регулярно)	раз у раз; абы` час
то и знай (с перерывами)	раз-пораз; раз у раз
то ли дело	і`ншая рэч
то-то и оно (в том-то и дело)	тож-бо-то
товарищ	тава`рыш, ся`бар
товарищеский	тавары`скі, сяброўскі
товарищество (между людьми)	тавары`ства, сяброўства
товарищество (организация)	тавары`ства, сябры`на, суполка
тогда	тады`
тогда-то	тады` й тады`
тогда как	тым ча`сам як
тогдашний	тады`шны, тагача`сны, той
того и жди	так і чака`й
тождественность	тоеснасьць
тождественный	тоесны
тоже	такса`ма, гэтакса`ма
ток (электр.)	ток, [пруд]
Токио	Токіа
толика	кры`ха, ка`ліва
толк	панталы`к, глузд
толкатель (*тех.*)	штурха`ч
толкать (локтем в бок)	штурха`ць
толкать (перед собой тачку)	пхаць, пхнуць
толкать (ядро)	штурха`ць
толкать (на мысль)	наводзіць
толкать (на преступление)	падбіва`цьпад’ю`джваць
толкать (в пропасть)	штурха`ць
толкать (на поступление в институт)	заахво`чваць
толкователь	тлумача`льнік, [тлу`мач]
толковать (объяснять)	тлума`чыць
толковать (беседовать)	гу`тарыць, гамані`ць
толковать (рассказывать)	распавяда`ць, раска`зваць
толковать (разговаривать)	размаўля`ць, гавары`ць
толковать (говорить)	гавары`ць, каза`ць

толковый (человек)	з глу`здам
толковый словарь	тлумача`льны слоўнік
толкотня	штурхані`на, таўхані`на
толкучка (рынок)	тандэ`т
толмач	тлу`мач
толокно	пу`тра, [ме`лта]
толочь	таўчы`
толстобрюхий	чарава`ты
толстовато	вотаўсьця, вогрубя
толстый	таўсты`, гру`бы
толстяк	пяньцю`х
толочь	таўчы`
толпа	натоўп, гурба`, гурма`, грамада`, [сьціжба`]
толпиться	тоўпіцца
толстенный	таўшчэ`разны
толстозадый	[купра`ты], [кляха`ты]
толчея	штурхані`на, таўкатня`
толчёный	тоўчаны
толчок	штуршок, таўхе`нь, штурхе`ль
толща	тоўсьць
толщина	таўшчыня`, таўсьціня`
только	толькі, адно
только бы	абы`б
только видимость	толькі знак
только если	толькі калі`
только что	толькі што, за`сьвежа, [адношта]
томительный	зьнібе`лы
томиться (о человеке)	тамава`цца, зьнібе`ць, [кохнуць]
томиться (о еде)	перасу`швацца, сьмя`гнуць
томление (изнурение)	тамава`ньне, зьнібе`ньне
томлёный	усьмя`глы
томный	мля`вы
тон	тон, [ваг]
тоненький	таню`сенькі
тонкий	тонкі, це`нькі
тончать	танчэ`ць
топ-топ	ту`пу-ту`пу, трэсь-лом
топить (пускать ко дну)	тапі`ць
топить (сало и т.п.)	тапі`ць

топить печь	палі`ць у пе`чцы
топкий (о дровах)	па`ліўны
топкий (дающий много тепла)	па`лкі
топкий (болотистый)	гра`зкі, багні`сты
топливо	па`ліва, апа`л
топляк	тапе`льнік
тополиный (пух)	таполевы
тополь	таполя
тополь (белый)	ясака`р
топор	сяке`ра
топорщиться	тапы`рыцца
топот	ту`пат
топотать	тупаце`ць
топтать	тапта`ць, пляндрава`ць, пля`жыць
топтать (посевы)	дратава`ць, талачы`ць
топь	ба`гна, багно, багні`ска, дрыгва`, тапіна`, затопа, [крокаць], [алёс]
торг (рынок)	торжышча
торг (на рынке)	га`ндаль
торговать	гандлява`ць
торговец	гандля`р
торговец салом	са`льнік
торговля	га`ндаль
торговый	гандлёвы
торжественно	урачы`ста
торжественно приветствовать	урачы`ста віта`ць
торжественность	урачы`стасьць
торжествовать над врагом	перамага`ць ворага; браць верх над ворагам; трыюмфава`ць
торжествовать по причине избрания в президенты	ра`давацца з нагоды абра`ньня ў прэзыдэ`нты
торжествовать победу	сьвяткава`ць перамогу
торица (*бот.*)	сьвінакроп
тормоз	гаму`лец
тормоза	гаму`льцы
тормозить	гамульцава`ць
тормошить	тармасі`ць, ту`ркаць, кату`рхаць, ту`заць, валту`зіць
торная дорога	бі`ты шлях
торопить	прысьпе`шваць

торопиться	сьпяша`цца
торопливый	хапатлі`вы, хапаткі`, пасьпе`шлівы
торчком	потарч, старчаком
торчмя	насторч, тарчмаком
тоска	туга`, жальба`
тоскаться (где-попадзя)	швэ`ндаць, блы`ндаць, бадзя`цца
тоскливый	тужлі`вы
тосковать	тужы`ць
тот	той
тотчас	адра`зу, тут-жа, неадкла`дна
точило	вастры`лка
точильщик (жук)	ша`шаль
точить (затачивать)	вастры`ць, пра`віць
точить (косу)	мянці`ць, мянта`шыць
точить лясы (балясы)	блы`нды пра`віць; андры`дулы (анцыбу`ры) не`сьці
точка (*грам.*)	кропка
точка (торговая и т.п.)	пункт
точка (на точиле)	вастрэ`ньне
точка зрения	пункт гле`джаньня, [гляньво]
точка расположения (чего-либо)	ме`сца
точно	дакла`дна
точно (в три часа)	роўна
точно (как раз)	ры`хтык, акура`т, якра`з
точно (с цепи сорвался)	бы`ццам, нібы`
точно!	так! ага`! пра`ўда! сапраўды`!
точность	дакла`днасьць
точный	дакла`дны
точный (о человеке)	акура`тны, пунктуаль`ны
точь в точь (тютелька в тютельку)	рыхт у рыхт, чырк у чырк, цот у цот, якра`з як, як лёду
тошнит	ваніту`е, гі`дзіць, млосна, ну`дзіць
тошно	моташна, млосна
тошнота	млосьць, нудота
тощать (худеть)	худзе`ць

тощать (скуднеть)	мізарне`ць, пусьце`ць
трава	трава`
трава (молодая, мягкая)	мурава`
трава (некошенная)	не`каш
трава (засушенная)	зёлкі
трава (густая, сочная)	ва`ра
трава (вторая после покоса)	ата`ва
трава (скошенная на льду)	віша`р
трава (прошлогодняя)	па`суш
трава (ползучая)	дзермяза`
трава (приворотная)	га`рнік
трава (сеяная после озимых и яровых)	салядэ`ра
травить (ядом)	тру`ціць, атру`чваць
травить (собаками)	цкава`ць, [чва`ліць]
травить (плохим отношением)	му`чыць, не дава`ць спакою
травить баланду	ваду` (пустое) малоць; рот халадзі`ць
травка	траві`ца
травля	цкава`ньне
травма	ура`за
традиционный	традыцы`йны, [паданёвы]
тракт	гасьці`нец
трактир	карчма
трактирчик	карчомка
трактирщик	карчма`р
трамбовка (приспособление)	шля`га
трамплин	трамплі`н, падгоп
транжирить	манта`чыць, марнатра`віць
транзит	транзы`т
транспорант	транспара`нт, [кара`кса]
транспортирование	транспартава`ньне
траншея	траншэ`я, закоп
трапеза	яда`
трапезничать	е`сьці
трапеция	трапэ`цыя, [трапэ`з]
тратить (деньги)	тра`ціць
тратить (зря)	глумі`ць, марнава`ць, ма`рна траціць
траур	жалоба
траурный	жалобны
трафарет	трафарэтка

трафаретный	трафарэ`тны, [адузорны]
трахея	гды`рха
треба (*рел.*)	адпра`ва
требование	патрабава`ньне
требования времени	вымогі ча`су
требовательный	патрабава`льны, вымогчывы
требовать (разъяснений)	патрабава`ць
требовать (настойчиво)	вымага`ць
требовать (добиваться)	дамага`цца
требовать (вызывать)	выкліка`ць
требовать (звацъ)	клі`кацъ
требовать деньги	спаганя`ць грошы
требуха	вантробы, бэ`бахі, трыбухі`
тревога	трывога, мітрэ`нга
тревожить	трывожыць, мітрэ`нжыць
треволнения	дале`глівасьць, [стаканота], [пару`ха]
трезвон (колоколов)	перазвон, звон
трезвонить (в колокола)	дзвані`ць
трезвонить (языком)	балабоніць, пустазьвя`гаць
трезвый	цьвярозы, памяркоўны, устрыма`ны, [чы`ты]
треклятый	пракля`ты
трель (птицы)	пошчак
тренировка	трэнэрава`ньне, спрактыкава`ньне
тренькать	тромкаць, бры`нкаць
трепать (развевать)	разьвява`ць
трепать (рвать)	рваць
трепать (мотать)	матля`ць
трепать (трясти)	трэ`сьці
трепать (тормошить)	тармасі`ць
трепать (дёргать)	ту`зацъ
трепать (лён)	трапа`ць
трепать (поносить кого-либо)	бузава`ць
трепать (волосы)	перабіра`ць, кудла`ціць
трепать (за волосы)	цяга`ць, ту`зацъ
трепать (одежду)	трапа`ць, дзе`рці, бузава`ць, драць
трепать (о лихорадке)	трэ`сьці
трепать (по плечу)	ля`пацъ, паля`пвацъ
трепать (бить)	калашма`ціць
трепать нервы	вантробы ад'яда`ць

	(выцяˋгваць); дуˋхі даставаˋць
трепать (чесать) языком	языком мянціˋць (малоць, пляˋскаць); язы`к аб зуˋбы біць
трепач	трапло, балбатуˋн
трепет	трымцеˋньне
трепетать	трымцеˋць
трепетный	трапяткіˋ, трымцьліˋвы, трапятліˋвы
трепыхнуцца	страпянуˋцца
треска (рыба)	тлушчоўка
трескотня	таркатаˋньне, балбатняˋ
трескаться	рэˋпацца
треснувший	прасеˋлы, рэˋпаны
трести	трэˋсьці
трести (яблоки)	абіваˋць, латашыˋць
третий	трэˋці
третичный	трайковы
треть	трациˋна
треугольник	трохкуˋтнік
трефы (карточная масть)	жалудыˋ
трещать (по сорочьи)	сакатаˋць
трещать (по лягушачьи)	скверашчаˋць
трещётка	кляшчотка
трещина	рэˋпіна, расколіна, пераскёп
трёпка (побои)	трапкаˋч, лупцоўкаˋ
трёхкратный	трохразовы
три	тры
три раза	[разоў тры]
три с половиной	паўчвартаˋ
трибуна	трыбуˋна, моўніца
тривиальный	трывіяˋльны, плюˋгкі
трижды	тройчы
триумф	трыюˋмф, урачыˋстасьць
трифоль (*бот.*)	бабок
трогает (волнует, обидно)	абходзіць
трогай!	руш! пайшла!
трогательный	прачуˋлы, чульліˋвы, заміла ваˋльны
трогать (рукой)	кранаˋць, краˋтаць, чапаˋць
трогать (задевать кого-либо)	чапаˋць

трогать (в путь)	ру`шыць
трогать (о чувствах)	крана`ць, расчу`львацъ, узру`шваць
трогаться (с места)	кра`тацца, ру`шыцца, крана`цца
троглодит	трагляды`т, пячорны чалаве`к
Троица (Пятидесятница)	Сёмуха
тройка (в дневнике)	тройка
тройка (людей)	тройца
тройственность	траі`стасьць
тронуть душу	ура`зіць (крану`ць) душу` (сэ`рца)
тронуться (с места)	скрану`цца
тропа	сьцяжы`на, сьце`жка
тростник	трысьнёг, трысьцё
трость	кій, трысьці`на, [тырс]
тротуар	ходнік, хадні`к, ходзішча, масткі`
трофей	трафе`й, [лу`пы]
труба	труба`, [ру`ра]
труба (водосточная)	ры`на
труба (печная)	комін
трубка (для курения)	лю`лька, пі`пка
трубка (турецкая)	стамбу`лка
трубочист	каміна`р
трубчатый	трубча`сты, трубкава`ты
труд	пра`ца
трудиться	працава`ць, рабі`ць
трудно	ця`жка
трудновато	заця`жка
трудность	ця`жкасьць
трудные времена	ліха`я гадзі`на
трудоёмкий	працаёмкі, [працахлонны]
трудолюбивый	працаві`ты, пату`жны
трудяга	працаве`нь, рабоцька, рабача`й
трудящийся	працоўны
трунить	кпіць
трус	баязьлі`вец, [трус]
труса праздновать	у кусты` пазіра`ць (глядзе`ць); зуба`мі звані`ць
трусливый	баязьлі`вы

трусцой	тру`хам, трушком, подбегам
трут (для высекания огня)	губа`, цэ`ра
труха	пацяру`ха
труха (древесная)	парахня`
трущоба (леса)	не`тры
трущоба (города)	лама`рня
трынь-трава	а`ні шум баравы`
тряпка	ану`чка, ану`ча, ашмётка
тряпьё	рызьзё, лахманы`, рызманы`
трясина	дрыгва`, ба`гна
тряска	калатне`ча
тряский	дрогкі
трясти (ногой, рукой)	трэ`сьці
трясти (в телеге)	трэ`сьці
трясти (яблоки, груши)	абіва`ць, трусі`ць, латашы`ць
трясти (коврик)	сьце`паць
трясти (мешок)	вытраса`ць
трясти (пробирку)	калаба`ціць
трясти (бить в ознобе)	трэ`сьці, калаці`ць
трясучка	трасца`, ліхама`нка
тряхнуть	страсяну`ць, скалану`ць
туберкулёз	сухоты
тугой (лук)	пру`гкі
тугой (человек)	нячу`лы, непамяркоўны, скупы`
тужиться	пя`цца, пну`цца, жы`ліцца
тузить	біць, лупцава`ць, дуба`сіць
туесок	вярэ`нька
туловище	ту`лава, [ту`луб]
туловище (птицы)	хлуп
тулуп	кажу`х
тулупщик	кажу`шнік
тумак	кухта`ль, штурхане`ц, грыма`к
туман	імгла`, па`расць
туманиться	імглі`цца
тумба	ту`мба, стабу`р
тунеядец	дармае`д
тупоумие	недаўсьці`п
турист	*туры`сты, [гайса`к]*
турнир (рыцарский)	*[шырме`рства],*

	[запа`сьніцтва], [гарцоўнік], [гарц]
турок	ту`рка
турусы на колесах	журавe`ль на хвойцы; смаляны` дуб
Турция	Турэ`ччына
тусклый	цьмя`ны
тускнеть	цьмяне`ць
тут же	за`раз
тухлый	тухля`вы
тухлятина	здыхля`ціна
тухлятина (запах)	тхлі`на
тухнуть (гаснуть)	згаса`ць
тухнуть (гнить)	ту`хнуць
туча	хма`ра
туча (саранчи)	[дзьвіна`]
тучнеть	сыце`ць
тучнеть (о колосе)	наліва`цца
туша	полць
тушить (готовить)	гатава`ць на па`ры
тщание	пі`льнасьць
тщательный (старательный)	стара`нны
тщательный (усердный)	руплі`вы, ру`пны, шчы`ры
тщательный (внимательный)	пі`льны, дба`йны, ува`жлівы
тщательный (аккуратный)	акура`тны, аха`йны
тщательный (точный)	дакла`дны
тщедушный	нядошлы, ляда`чы
тщеславие	славалю`бства, пустахва`льства, [парожняя сла`ва]
тщета	ма`рнасьць, [ту`ннасьць]
тщетно	ма`рна, дарэ`мна, [тунна]
тщиться	намага`цца, стара`цца, пну`цца, пя`цца
ты прав	твая` пра`ўда; пра`ўду ка`жаш; на тваі`м баку` пра`ўда
тыква	гарбу`з
тысячелистник (*бот.*)	крыва`ўнік
тычком	старчма`, старчаком
тюк	трок
тюльпан	тульпа`н
тюрбан	цюрба`н

тюрьма	вязьні`ца, турма`
тюфяк	сяньні`к, [шасьце`ль]
тюфяк (о человеке)	цюхця`й, пяхце`р
тьма	це`мра, це`мрадзь
тьма (огромное количество)	плойма, процьма, бе`зьліч, сьці`жма
тьфу!	кархе`ль! ага-ту!
тюря (*кул.*)	цура`
тявкать	зьвя`гаць, я`ўкаць
тявкающий	зьвяглі`вы
тягостный	цяжкі`
тягость	цяжа`р
тягаться (соревноваться)	ходацца
тягость	цяжа`р, ця`жкасьць
тяготение (*физ.*)	прыцягне`ньне
тяготение (к чему? к кому?)	ця`га (да чаго? да каго?)
тяготить	абцяжа`рваць, быць у ця`жар, гнясьці`
тяж (в телеге)	атоса
тяжба	цягані`на
тяжеловоз (конь)	аграма`к
тяжесть	цяжа`р
тяжёлые обстоятельства	цяжкі`я абста`віны, ату`га
тяжёлый	цяжкі`
тянуть (воз)	цягну`ць
тянуть (запахом)	па`хнуць, тхнуць
тянуть (воровать)	кра`сьці, цягну`ць
тянуть (выматывать) душу	ду`хі выма`ць; сэ`рца ад'яда`ць (кроіць)
тянуть жилы	жы`льле выця`гваць; жы`лы дастава`ць
тянуть жребий	цягну`ць лёсы; лёсаваць
тянуться из последнего	жы`лы напіна`ць (пяць)
тяп да ляп (тяп-ляп)	ца`пу-ла`пу, чапані`на-лапані`на
тяпка	маты`чка, дра`пкі, дра`пцы, га`чка
тятя`	тату`ля

у	
у дороги	пры дарозе
у моря	каля` (ля) мора
у него болит сердце	ён хворы на сэ`рца
у чёрта блины поест	у чорта малі`тву даста`не

у чёрта на куличках	за сьве`там; у віра`х на юра`х (у чортавых зуба`х); проці лі`ха на ўзгорку (дзе пень на калоду брэ`ша)
уа-уа! (о детях)	куга`-куга`!
убавить (скорость)	сьці`шыць
убавить спеси	рогі пазьбіва`ць
убаюкать (ребёнка)	закалыха`ць, залюля`ць
убаюкать (взрослого)	нагна`ць дрымоту
убаюкать (успокоить)	заспакоіць
убегать	уцяка`ць
убедительная (просьба)	вялікая
убедительно	перакана`ўча, даводна
убедительно (прошу Вас)	ве`льмі моцна
убедительный (ответ)	перакана`ўчы, даводны
убеждать	пераконваць, даводзіць, запэ`ўніваць
убеждение	перакана`ньне
убеждённо	перакана`на, упэ`ўнена
убежище	прыту`лак, схрон, прыста`нішча
убежище (воен.)	сховішча
убей меня господь!	каб я ўдаўж ла`ўкі вы`прастаўся! каб я сьве`ту ня ба`чыў!
уберечь	захава`ць, усьцерагчы`, упільнава`ць, увартава`ць
убивать время	дні це`рці; дзянькі` зводзіць; час марнава`ць
убийственный (смертельный)	забойны, забойчы, пагі`бельны, непамілу`йны
убийственный (вредный)	шкодны, ва`дны
убийственный (взгляд)	жахлі`вы
убийство	забойства, забой
убийца	забойца
убирайтесь отсюда!	прэч адсюль! выбірайцеся адсюль!
убираться (в помещении)	агляда`цца
убитый	забі`ты
убитый горем	змарцьве`лы
убить (человека)	забі`ць
убить (уничтожить)	зьні`шчыць
убить (ошеломить)	агаломшыць, прыгне`сьці

ублаготворить	задаволіць, улагодзіць
ублажать	уласка`ўліваць, здавольваць, улагоджваць
убогий	субожны
убожество	злы`беда, нябоства
убой (скота)	рэз
убор	строй
убористый (почерк)	спорны, дробны
убористый (текст)	сьці`слы
уборка урожая	жніво
уборка помещения	вогледка, пра`таньне
уборщица	прыбіра`чка, прыбіра`ньніца
убояться	збая`цца, спалохацца, зьляка`цца
убранство	ша`ты, убра`ньне
убрать (посуду со стола)	прыня`ць
убрать (паруса)	зьняць, скруці`ць
убрать (оратора со сцены)	сагна`ць, скіну`ць
убрать (якорь)	падня`ць
убрать (комнату)	аглядзе`ць
убрать (прочь руки)	прыня`ць
убрать (украсить)	аздобіць, убра`ць, прыбра`ць
убрать (урожай)	зыбра`ць, сабра`ць
убрать (шахматы в шахматницу)	злажы`ць
убрать (книги в шкаф)	схава`ць
убрать (зерно в амбар)	ссы`пацць
убрать (все слова в строку)	увабра`ць, умясьці`ць
убрать (с должности)	зняць
убрать (абзац из статьи)	вы`даліць
убрать (ученика из класса)	вы`гнаць, прагна`ць, вы`турыць, вы`правадзіць
убывать (о воде)	спада`ць
убывать (о луне)	убыва`ть
убывать (о здоровье)	падупада`ць
убывать (куда-либо)	выбыва`ць, выпраўля`цца
убывать (уменьшаться)	ме`ншаць, зьмянша`цца
убыль (воды)	спад
убыль (потери)	стра`ты
убыль (уменьшение)	зьмяншэ`ньне
убытки	стра`ты
убыточный	стра`тны
уважаемые господа!	шаноўнае спада`рства!

уважаемый	паважа`ны, шаноўны
уважаемый (всеми)	шанава`ны
уважать	паважа`ць, шанава`ць
уважение	пава`га, шанава`ньне, паша`на
уважительный	ува`жны, пава`жлівы
уважить (людей)	паўважа`цца
увал	адхон
увалень (тюфяк)	ваву`ла, цюхця`й, цяльпу`к, не`паварацень, пяхце`р
уведомление	паведамле`ньне, спаве`шчаньне
уведомлять	паведамля`ць, спавяшча`ць
увенченный	каранава`ны
увенчаться (успехом)	пасьпяхова завяршы`цца
увенчивать (кого-либо)	каранава`ць
уверен	пэ`вен
уверение	запэ`ўніваньне, упэ`ўненьне, сцьве`рджаньне
уверенный	пэ`ўны, перакана`ны
уверить	запэ`ўніць, перакана`ць
увернуть (во что-либо)	укруці`ць
увернуться (от удара)	адхілі`цца, адхіну`цца, адкасну`цца
увернуться (от ответа)	вы`круціцца, ухілі`цца
уверовать	даць ве`ры, паве`рыць
увеселительный	заба`ўлівы, паце`шлівы, вясёлы
увесистый	ува`жысты, ва`жкі
увести (из зала дебошира)	вы`весьці
увести (детей на прогулку)	паве`сьці
увести (пьяного мужа домой)	заве`сьці
увести (своровать)	укра`сьці
увести (чужую жену)	зьве`сьці, адбі`ць
увечить	няве`чыць, кале`чыць
увечье	кале`цтва
увещать (увещевать, усовещевать)	наўпаміна`ць, ура`йваць, пераконваць, угаворваць, упэ`ўніваць
увёртки	выкру(н)та`сы, хі`трыкі, вывароткі
увёртливость	спрыт
увиваться (ухаживать)	увіха`цца, увіна`цца, заляца`цца
увидеть	уба`чыць, угле`дзець

увидеться	уба`чыцца, паба`чыцца
увлажнять	увільгатня`ць, ві`льжыць
увлекательный	займа`льны, захоплівы
увлекаться	захапля`цца, ва`біцца
увлекающийся	ва`бкі, захопчывы
увлечение (театром)	захапле`ньне
увлечение (влюблённость)	захапле`ньне, закаха`насьць
увлечение (в секту)	уцягне`ньне, залы`гваньне
увлечение (пыл)	запа`л
увлечь (за собой)	уцягну`ць
увлечь (идеей)	прыва`біць
увод (кража)	крадзе`ж, выкрада`ньне
увод (в сторону)	адвод
уволить (с работы)	звольніць
уволить (с должности)	вы`зваліць
уволочь (своровать)	скра`сьці
уволочь (в сторону)	звалачы`, павалачы`
увольнение	звальне`ньне
уврачевать	вы`лечыць
увы!	авохці мне!
увядать	вя`нуць
увядать (о человеке)	марне`ць, чэ`знуць
увядший	зьвя`лы
увядший (о человеке)	змарне`лы
увязать (связать)	зьвяза`ць
увязать (вопрос)	узгадні`ць
увязать (в грязи)	уграза`ць
увязать (в повседневности)	уграза`ць
увязаться (за кем-либо)	уле`гчы, упле`нтацца
угадыватель	уга`дзька
угар	чад
угареть	уча`дзець
угарный	ча`дны
угасающий (огонь)	згаса`льны
угаснуть (об огне)	зга`снуць, сцьмець
угаснуть (о человеке)	паме`рці, скана`ць
угасший	зга`слы
углекоп	вугля`р
угли (горящие)	жар
угловой	ку`тні, нарожны
углубитель	паглы`бнік
углубить (канаву)	паглы`біць

углубление (канавы)	паглыбле`ньне
углубление (впадина)	запа`дзіна, падзь
углубление (яма)	я`ма, ямка
углубление (вообще)	заглыбле`ньне
углубляться (в вопрос)	паглыбля`цца, занура`цца
угнетатель	прыгнята`льнік
угнетающий	прыгнята`льны
угнетение	прыгнёт, прыці`ск
угнетённый	прыгне`чаны, [прыгноблены]
уговор	угода, ула`дзіны, дамовіны
уговорить (уломать)	умалёгаць, згадзі`ць, угамоніць
угодить (попасть)	тра`піць, апыну`цца, уброхацца
угодить (выслужиться)	дагадзі`ць
угодливый	дагодлівы, панароўны, улёсьлівы
угодник	панароўнік, укорнік, дагоднік
угодный (нужный)	патрэ`бны
угодный (желательный)	пажада`ны
угодный (пригодный)	прыда`тны
угодничество	панаро*ўка, дагодлівасьць*
угождать	нараві`ць, дагаджа`ць, гадзі`ць, падла`шчвацца
угождать вопреки желанию	гадзі`ць як ліхой ску`ле
угол (внутри)	кут
угол (снаружи)	рог
уголёк (горящий)	жары`нка, пры`ска
уголовный	крыміна`льны
уголок	заку`так, куток
уголок (платка)	ражок
уголь	ву`галь
угольщик	ву`гальнік
угомонять	гамава`ць
угон (автомобиля)	крадзе`ж
угораздить	собіць
угореть	уча`дзець
угорь	даўга`р
угощать	чостава`ць, трактава`ць
угощение	пачостка, пачасту`нак, трактава`ньне, частава`ньне
угрожать	пагража`ць
угрожать здоровью	стая`ць на здароўі
угроза	грозьба, пагроза
угрохать (машину)	размалаці`ць
угрызение	згрызота

угрызения совести	згрызоты сумле`ньня
угрюмый	пану`ры, пахму`ры, хму`рны
удавиться (в петле)	засі`ліцца
удавка	за`хлыска, за`шмарга
удалённый (на расстоянии)	адда`лены
удалённый (из класса)	вы`далены, вы`праваджаны
удалить (предмет от глаз)	адда`ліць
удалить (детей из комнаты)	вы`весьці
удалить (ученика из класса)	вы`даліць, вы`гнаць, вы`турыць, вы`правадзіць
удалить (из университета)	вы`ключыць
удалить (из списка)	вы`касаваць
удалить (опухоль)	вы`разаць
удалить (зуб)	вы`рваць
удалить (занозу)	вы`няць
удалить (руку)	адрэ`заць
удалить (пыль со стола)	ачы`сьціць
удалить (опасность)	адхілі`ць, адхіну`ць
удалить (снег с тротуара)	прыбра`ць
удалой	зухава`ты, заліхва`цкі
удаль	зухава`тасьць, заліхва`цкасьць
удар	уда`р, [вы`цень]
удар (розгою)	[шлёг]
удар (пятою ноги)	вы`сьпятак
удар судьбы	[нячы`вель]
ударение (в слове)	на`ціск
ударил (мороз)	нахапі`ўся
ударить (кого-либо)	вы`тнуць, вы`цяць, тры`кнуць
ударить лицом в грязь	у гразь ля`снуцца (пля`снуцца); плясь у гразь
ударить по рукам	парука`цца
удариться (войти) в амбицию	у хаму`т даць; у халя`ву ўступі`ць; кля`мка запа`ла
ударник (труда)	[узорнік]
ударный (*грам.*)	націскны`
ударный (труд)	узорны
ударный (инструмент)	уда`рны
удача	посьпех, шчасьце, пры`дача
удачный (случай, исход)	уда`тны

удачный (прибор, костюм)	уда`тны, добры, прыда`тлівы
удачный выстрел	тра`пны стрэл
удачный ответ	уда`тны (тра`пны) адка`з
удачный перевод	уда`тны перакла`д
удвоение	падвае`ньне
удел (участь)	наканава`ньне, кон, лёс, доля
уделить (время, внимание)	узы`чыць, нада`ць
удерж	упы`нак, упын
удержать (коня)	стрыма`ць
удержать (ежа в руках)	утрыма`ць
удешевить	патаньні`ць, зьме`ншыць цану`
удешевление	патаньне`ньне
удивительный (странный)	дзі`ўны
удивительный (чудесный)	цудоўны, дзівосны
удивить	задзіві`ць
удивиться	задзіві`цца, дзі`ву даць
удивляться (с кого? с чего?)	дзіві`цца (на каго? на што?), дзівава`цца (на каго? на што?), дзі`ву дава`цца (з каго? з чаго?)
удила	цу`глі, [сьця`гры], [склю`гі]
удилище	вудзі`льна, вудаві`ла
удильщик	ву`даль
удлинёный	падоўжаны
удлинитель (*тех.*)	падаўжа`льнік
удлинить	падоўжыць, надтачы`ць
удлиниться	падаўжэ`ць
удобнее	ямчэ`й, зручне`й
удобно	зру`чна, ёмка
удобный (дом)	выгодны
удобный (стул)	зру`чны, ла`твы, ёмкі
удобный (о почве)	прыда`тны
удобоваримый (лёгкий для переваривания)	лёгкастра`ўны
удобоваримый (лёгкий для понимания)	даходны
удобоуправляемый	лёгкі (зру`чны) для кірава`ньня
удобоусвояемый	лёгкі для засвойваньня
удобрение	угнае`ньне, гной
удобрять	угнойваць
удобство (в чём-либо)	выгода, выгодзьдзе

удобство (от чего-либо)	зру`чнасьць, ла`твасьць, ёмкасьць
удовлетворение	*здавальне`ньне*
удовлетворительный	*здавальня`ючы*
удовлетворить (себя)	*здаволіць*
удовлетворить (потребность в самолётах)	*забясьпе`чыць*
удовлетворить желание	*спагна`ць ахвоту*
удовлетворять	*здавальня`ць*
удовлетворять похоть	*здавальня`ць пахаці`нства*
удовольствие	*здаволенасьць, здавале`ньне, прые`мнасьць*
удод	*ту`кайка*
удостоверение	*сьве`дчаньне, пасьве`дчаньне, засьве`дчаньне*
удостоверение (документ)	*пасьве`дчаньне*
удостоверить	*засьве`дчыць*
удостоить (*разл.*)	*учці`ць, нада`ць годнасьць, узнагародзіць*
удосужиться	*[спавольніцца]*
удочка	*ву`да*
удрать	*уцячы`*, дацъ лататы`, зьбе`гчы
удружить	*узы`чыць, зрабі`ць ла`ску, услужы`ць*
удручать	*гнясьці`, прыгнята`ць, засмуча`ць*
удушье	*заду`ха*
уединение	*самота*
уединённый (от всего)	*адасоблены*
уединённый (ото всех)	*самотны*
уединённый уголок	*заці`шак*
уединяться	*адасабля`цца, асобіцца*
уезд	*паве`т*
уездный	*павятовы*
уж (уже)	*ужо*
уж (*зоол.*)	*вуж*
ужас	*жах, жуда`, [ворах]*
ужаснуться	*жахну`цца*
ужасный	*жахлі`вы, пачва`рны, жу`дасны, жудлі`вы, [ворашны]*
ужать	*сьці`снуць*
ужать (текст)	*скараці`ць*

ужесточить	*узмацні`ць жорсткасьць*
ужимки	*крыўля`ньні, крывёлы, гіморы*
ужин	*вячэ`ра*
ужинать	*вячэ`раць*
узда	*аброць*
узел (на верёвке)	*ву`зел*
узел (одежды)	*клу`нак, клу`мак, хату`ль*
узел (волос в причёске)	*ку`кла*
узнать (кого-либо, что-либо)	*пазна`ць, распазна`ць*
узнать (о чём-либо, о ком-либо)	*даве`дацца, дазна`цца, прачу`ць*
узнать (испытать)	*спазна`ць, зьве`даць, зазна`ць*
узнать правду	*даве`дацца пра`ўды*
узник	вя`зень
узор	кару`нак, [дэ`сань]
узор (ажурный)	мярэ`жа, мяр`эжка
узорный	кару`нкавы
узоры	кару`нкі, [анталя`жы]
узоры (вырезанные из бумаги)	выціна`нкі
узоры (вязаные)	хварботы
узреть	уце`міць, угле`дзець
узы	вя`зі, пу`ты, шпоны, ланцугі`, [паварозьзе]
уйма	плойма, процьма, бе`зьліч, сьці`жма
уйти (в школу)	пайсьці`
уйти (из дома)	вы`йсьці
уйти (в соседнюю деревню)	адысьці`ся
уйти (от жены)	сысьці`
уйти (от ответственности)	уні`кнуць
уйти (в сторону леса)	скірава`ць, пада`цца
уйти (от врага)	уцячы`
уйти (от удара)	ухілі`цца
уйти (с дороги)	сысьці`, саступі`ць
уйти (вытечь через щель)	вы`цечы
уйти (о времени)	прайсьці`, міну`ць
уйти (в себя)	паглы`біцца, зану`рыцца
уйти (о часах) и г.д.	сьпяша`цца і т.д.
уйти вперёд	апярэ`дзіць

уйти ни с чем	з хлю`стам пайсьці`
указ	ука`з
указатель	показь
указать (пальцем на кого-либо)	паказа`ць
указать (на недостатки в работе)	зазна`чыць
указать (дорогу)	паказа`ць
указать (книгу)	назва`ць
указать (как вести работу)	распаве`сьці, растлума`чыць, навучы`ць
указать (место встречи)	вы`значыць, прызна`чыць, назва`ць
указать (время приезда)	вы`значыць, прызна`чыць, назва`ць
укараулить	упільнава`ць
укатать (дорогу)	уе`зьдзіць, аба`біць
уклад (жизни)	пара`дак
уклея (*зоол.*)	сіля`ва
уклон (горы)	схіл, нахі`л
уклон (в сторону)	ухі`л
уклонение (отклонение)	адхіле`ньне
уклонение (от работы)	ухіле`ньне, унікне`ньне
уклончивый (спуск)	ухі`лісты
уклончивый (взгляд)	уні`клівы
уклоняться (отходить в сторону)	ухіля`цца, адхіля`цца, збочваць
уклоняться (от удара)	ухіля`цца, адхіля`цца
уклоняться (от работы)	ухіля`цца, уніка`ць
уклоняться (от врага)	адступа`ць, адыходзіць
уклоняться (от темы)	адхіля`цца, адыходзіць, адступа`ць
уклоняться (от знакомства)	ухіля`цца, уніка`ць
уклоняться от закона	зьніка`ць ад пра`ва
уключина	кочат
уколоть (палец)	укалоць
уколоть (замечанием)	ужыгну`ць
укор (укоризна)	дакор, дакара`ньне, упі`ка, упіка`ньне
укоризненный	дакорлівы, упі`клівы
укорачивать (хвост)	уціна`ць
укорять	дакара`ць, упіка`ць
украдкой (втихоря)	ціхачом, цішком, крадком

украсть	вы`красьці, скра`сьці
украшать	аздабля`ць, прыбіра`ць, убіра`ць
украшение	аздоба, акра`са
укрепить (крепость)	умацава`ць
укрепить (флаг на крепости)	прымацава`ць
укрепление	умацава`ньне, [мацая`]
укромный (уголок)	заці`шны, уту`льны
укротитель	утаймава`льнік
укротить	утаймава`ць, уціхамі`рыць
укрупнить	узбуйні`ць
укрывать (*разл.*)	пакрыва`ць, закрыва`ць, накрыва`ць, укрыва`ць
укрытие (военных преступников)	хава`ньне, укрыва`ньне
укрытие (убежище)	сховішча
укрытие (защищённное место)	схоў, схрон, прыту`лак, заці`шак
укрыть (ребёнка)	накры`ць
укрыть (беглеца)	схава`ць
уксус	воцат
укутать	уху`таць, ушу`шкаць, захіну`ць, укруці`ць
уладить (дела)	зала`твіць, уладкава`ць
улежавшийся	уле`жаны
улей	ву`лей
улетучиться (о паре)	вы`парацца
улетучиться (о запахе)	вы`тхнуцца, пазапаве`трыцца
улетучиться (о дыме)	расьсе`яцца, разьве`яцца
улетучиться (о любви)	зьні`кнуць, прапа`сьці
улечься	уле`гчыся
улизнуть	вы`шмыгнуць, вы`сьлізнуць, [улытну`ць]
улика	доказ, дака`зка, [пры`сьветка]
улитка	смоўж
улица	ву`ліца
уличённый	[уліцкава`ны]
уличить (изобличить)	вы`крыць, [уліцкава`ць]
уличить (взять с поличным)	злаві`ць, [уліцкава`ць]
уличить (обвинить)	абвінава`ціць, [уліцкава`ць]
уличить (засвидетельствовать, доказать)	даве`сьці, [уліцкава`ць]

уличить во лжи	на хлусьні` злаві`ць, хлусьню` вы`крыць (вы`сьведчыць)
уловимый	улоўны, ухопны
уловитель (*тех.*)	улоўнік
уловка	вы`крут, выкрута`с, хі`трасьць, [уловіна]
уложить в гроб	у магі`лу ўвагна`ць; у труну` загна`ць; на драўня`нага каня` ўссадзі`ць
улучить момент	упільнава`ць злу`чнасьць
улыбающийся	усьміхнёны
улыбка	усьме`шка
ум	розум
ум за разум зашёл	глузды` завярну`ла
ума не приложить	розуму не дабра`ць; тропу не ўхапі`ць; глу`зду не прыста`віць; на цям ня йдзе
ума палата	моцная галава`; мозгі густы`я; розуму бага`та
умаление	ма`леньне, прымяншэ`ньне, зьніжэ`ньне
умалять	ма`ліць, прымянша`ць, зьніжа`ць
умаяться	стамі`цца, змарыцца
уменьшаться	ме`ншыцца
умелый	уме`йны, уме`лы
умение	уме`йнасьць, уме`ласьць
уменьшитель (*тех.*)	памянша`льнік
уменьшить	зьме`ншыць, скукожыць
умерение (умеренность)	ме`рнасьць
умеренные взгляды	памяркоўныя погляды
умеренный (*разл.*)	ме`рны, зьме`рны, умеркава`ны, памяркоўны, сярэ`дні
умеренный ветер	*сярэдні вецер*
умереть	*паме`рці*
умереть (в агонии)	*скаве`нчыцца*
умерить (гнев)	*стрыма`ць*
умерить (требования)	*зьме`ншыць*
умертвить (человека)	*забі`ць*
умертвить (нерв)	*зьмярцьві`ць*
умертвить (плоть)	*зьмярцьві`ць, утаймава`ць*
умерший	*паме`рлы*
умершие (недавно)	наўцы`, наўе`
уместный	дарэ`чны, слу`шны
умещаться	ме`сьціцца, зьмяшча`цца

умиление	замілава`ньне, расчу`ленасьць
умилительный	замілава`льны, які` расчу`львае
умилостивить (умилосердить)	ула`шчыць, уласка`віць
умильный (нежный, приятный)	*мі`лы*
умильный (льстивый, угодливый)	*дагодлівы, лісьлі`вы*
уминать	*жу`мрыць,* пуцава`ць, трупа`ціць
умирать	ме`рці, паміра`ць
умирать со смеху	з рогату канча`цца; ад сьме`ху заходзіцца
умиротворение	*замі`раньне, згода, супакой*
умиротворённый	*замі`раны, спакойны*
умнее всех	разумне`йшы над усі`х
умник	разу`мнік, мудраге`ль
умничать	разу`мнічаць, мудраге`ліць
умножаться	множыцца
умножение	множаньне
умный	разу`мны
умолишённый	вар'я`т
умозаключение	зьмеркава`ньне, выснова
умозрительный	разумовы, абстра`ктны
умолкающий	моўкны
умолчать	змоўчаць, нічога не сказа`ць
умолять	упраша`ць, [малёгаць]
умонастроение	лад ду`мак
умопомрачение	поблуд, чма`ра, помарака, [сумарок]
умопомрачительный	надзвыча`йны
умопомрачительный (ужасный)	жахлі`вы
умора	сьмехата`
уморительный	паце`шлівы, сьме`шны, фацэ`тны
уморить	змары`ць
умственный	разумовы
умствовать	мудрава`ць, мудраге`ліць
уму непостижимо	розумам не даста`ць (сягну`ць); у розум ня ўзяць
умудриться	злоўчыцца
умчаться	памчацца
умчаться (о годах)	прамільгну`ць, міну`ць, прайсьці`
умываться	мы`цца

умысел	наме`р, заду`ма
умышленно	наўмы`сна, сумы`сьля
умышленный (преднамеренный)	наўмы`сны, сумы`сны
унавоживать	угнойваць
унести (с собой)	пане`сьці
унести (из дому)	вы`несьці
унести (к соседу)	адне`сьці
унести (вниз в подвал)	зьне`сьці
унести (своровать)	скра`сьці, зьне`сьці
унести (ветром лодку)	зьне`сьці, пане`сьці
унести (о фантазии, мечте и т.п)	зане`сьці
унаследовать	успадкава`ць
униат	вунія`т
унижать	зьневажа`ць, прыніжа`ць
униженно	уні`жліва, уні`зьліва, зьнява`жліва
унизительный	зьневажа`льны, зьнява`жлівы, уні`зьлівы
уничижать	гні`біць, зьневажа`ць, абража`ць
уничижение	згні`ба, зьнява`га, абра`за
уничтожитель	зьнішча`льнік
уничтожить	зьні`шчыць, збэ`йсаць, спля`жыць, сплягндрава`ць, зглумі`ць
уничтожать	зьнішча`ць, глумі`ць, бэ`йсаць, пля`жыць
уничтожение	зьнішчэ`ньне, глум
уния	ву`нія
унываць	ныдзе`ць, смуці`цца
унылый	зныдзе`лы, засму`чаны
уныние	засмучэ`ньне
унять	утаймава`ць, сьці`шыць, супакоіць, суня`ць, уціхамі`рыць
упадок	заняпа`д
упаси (избави) бог!	барані` (хава`й) божа! няха`й бог кры`е!
упасть (на землю)	павалі`цца, ле`гчы
упасть (с крыши)	звалі`цца, скі`нуцца
упасть (на колени)	упа`сьці
упасть (о росе, тумане)	па`сьці
упасть (о тени)	ле`гчы
упасть (в силах,	спасьць, аслабець

ослабеть)	
упасть (о температуре, уровне воды)	зьні`зіцца
упасть (прийти в упадок)	заняпа`сьці, падупа`сьці
упасть (нравственно)	па`сьці, упа`сьці
упасть в колодец	уваліцца ў студню
упасть в обморок	самле`ць
упасть как подкошенный	пакаці`цца (павалі`цца, кульну`цца) як сноп; кулём ле`гчы
упереть (палку в стену)	упе`рці, упну`ць
упереть (глаза в стену)	утаропіць, уталопіць
упереть (своровать)	скра`сьці
упираться	упіна`цца, упіра`цца, упа`рціцца
упитанный	укормлены
упиться (славой)	паце`шыцца
уплата (выплата)	спла`та
уплетать (уписывать) за обе щеки	на два бакі` е`сьці; за абе`дзьве шчокі пе`рці; як у це`рніцу це`рці
уплотнитель (*тех.*)	ушчы`льнік
уплотнить	ушчыльні`ць
упование	надзе`я, спадзе`ў
уповать	спадзява`цца
уподобить	прыпадобніць, [сутокмець]
уподобление	*прыпадабне`ньне, [сутокма]*
упоение	*захапле`ньне, зачарава`ньне, асалода*
уполномоченный	*упаўнава`жаны*
уполномочить	*упаўнава`жыць*
упоминание	*зга`дваньне, зга`дка*
упоминать	*зга`дваць*
упомянутый	*памянёны, ме`нены, згада`ны*
упорный	*упа`рты, зацы`ты, заю`шны, заўзя`ты , заложны*
упорство	*упартасьць, заця`тасьць, заці`н, заўзятасьць*
упорядочивать	*пара`дкаваць, пара`дчыць*
употребление (*разл.*)	*ужыва`ньне, ужы`так, спажыва`ньне, тарнава`ньне*
употребляемый	*ужыткоўны, ужыва`ны, тарноўны*
употреблять (выражение)	тарнава`ць

употреблять (пищу)	спажыва`ць
употреблять во зло	марнатра`віць
употреблять на пользу	пажыткава`ць
управиться (с работой)	ухадзі`цца, уходацца
управление (заводом)	кірава`ньне
управление (завода)	упра`ва
управляемый	кірава`ны
управляющий	кірава`льны
управляющий (завода)	кіраўні`чы
упражнение	практыкава`ньне
упражняться	спрактыкава`цца
упразднить (расторгнуть, отменить)	скасава`ць, зьліквідава`ць
упреждать	запабяга`ць
упрекать	папіка`ць, дакара`ць, дапіна`ць
упрёк (укор)	папі`ка, папіка`ньне, дакор
упростить	спрасьці`ць
упрочить (положение)	угрунтава`ць, умацава`ць, утрыва`ліць
упрощение	спрашчэ`ньне
упругий	пру`гкі, пру`ткі
упряж	збру`я
упряжка	гужок
упрямец	упорнік, [запрыду`х]
упрямиться	упа`рціцца, упорнічаць, упіра`цца, нараві`цца
упрямство	упор, упа`ртасьць, нараві`стасьць
упрямый	упорны, упорысты, наравісты, знату`раны
упрятать	схава`ць, захава`ць
упрятать (в тюрьму)	засадзі`ць
упрятать (неизветно куда)	запраторыць
упущение	недагля`д, нядба`йнасьць
упырь (вампир)	наве`ц
упырь (*зоол.*)	кажа`н
ура!	рубон! вальлё!
уравнение (в правах)	ураўноўваньне
уравновесить	ураўнава`жыць
уравновешенный	зраўнава`жаны
уравнять (в правах)	зраўнава`ць
уровень	ме`жань, ровень
уровень (мор.)	ватэрпа`с

урод	вы`рад, звырод, звы`радзень, пачва`ра
уродиться	зарадзі`цца
уродливый	звыродлівы, пачва`рны
уродовать	няве`чыць, кале`чыць
урожай	ураджа`й, [урода]
урожайность	ураджа`йнасьць, [урод]
урок	ле`кцыя, наву`ка
урон	шкода, ву`йма, страта, [протар]
уронить (с рук)	упусьці`ць, вы`пусьціць
уронить (человека с крыши)	скі`нуць
уронить (потерять)	згубі`ць
уронить (слова)	кі`нуць, сказаць
уронить (голову на грудь)	апусьці`ць
уронить (авторитет)	стра`ціць
уронить слезу	прасьлязі`цца
урочище	урочышча, [гамонішча]
урчать	гурчэ`ць, ву`рзгаць, вурката`ць
урывками (бывать дома)	пры`скакам
усадить (гостей вокруг себя)	абсадзі`цца
усадьба	сядзі`ба
усадьба (господская)	фальва`рак
усач (о человеке)	вусаце`нь
усач (*бот.*)	марона, мірон
усвоить	засвоіць
усвоить себе привычку	узя`ць за звы`чай
усердие	гарлі`васьць, руплі`васьць, ру`пнасьць, уві`шнасьць
усердный	гарлі`вы, руплі`вы, ру`пны, уві`шны
